Источник: "Рэспубліка" - 2013-06-15

МА

# Даследчык гісторыі трох народаў

***Прэзентацыя выстаўкі “М. Доўнар-Запольскі — даследчык гісторыі трох народаў”, падрыхтаванай Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі і Санкт-Пецярбургскім філіялам Архіва Расійскай акадэміі навук, адбылася ў Мінску.***

Экспазіцыя, размешчаная ў інфармацыйна-выставачным цэнтры Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа НАН Беларусі, адлюстроўвае шматгранную навуковую дзейнасць вядомага беларускага гісторыка, этнографа, фалькларыста і эканаміста Мітрафана Віктаравіча Доўнар-Запольскага (1867—1934). Пасля перыяду забыцця спадчына даследчыка, які цесна звязаў сваё жыццё і творчасць з беларускім, украінскім і рускім народамі, пачынае актыўна вывучацца.

На стэндах прадстаўлена каля 100 дакументаў XVIII—XXI стагоддзяў з бібліятэчных фондаў: кнігі, артыкулы, рэцэнзіі Доўнар-Запольскага, літаратура пра яго жыццё і дзейнасць, працы з асабістага кнігазбору навукоўца з яго аўтографамі і пячаткамі. Таксама на выстаўцы экспануюцца фотаздымкі і ўспаміны пра Мітрафана Віктаравіча з архіва беларускага гісторыка Мікалая Улашчыка.

Вялікую каштоўнасць маюць копіі дакументаў, атрыманыя з Санкт-Пецярбургскага філіяла Архіва Расійскай акадэміі навук, Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва Украіны, Дзяржаўнага архіва горада Кіева, Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Цэнтральнага навуковага архіва НАН Беларусі, якія раскрываюць малавядомыя старонкі жыцця і дзейнасці нашага суайчынніка. Многія з гэтых дакументаў былі прадэманстраваны ўпершыню і толькі ў дзень адкрыцця выстаўкі.

**Дзмітрый ПАТЫКА, “Р”**

Дзмітрый Патыка. Даследчык гісторыі трох народаў